МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ «ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ П. М. МАШЭРАВА»

Філалагічны факультэт

Кафедра літаратуры

Дапушчана да абароны

«05» июня 2020 г.

Загадчык кафедры

А. У. Крыклівец

МАГІСТАРСКАЯ ДЫСЕРТАЦЫЯ

# БЕЛАРУСКАЯ ІНТЫМНАЯ ЛІРЫКА ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

Спецыяльнасць 1-21-80-10 Літаратуразнаўства

Мосін Анатолій Яраслававіч,
магістрант

Навуковы кіраўнік:
Бароўка Ванда Юльянаўна,
прафесар кафедры літаратуры,
доктар філалагічных навук,
прафесар

Работа защищена с оценкой «9» (девять) 23.06.2020 секретарь ГЭК №46

Віцебск, 2020

**Рэферат**

Магістарская дысертацыя 70 с., 70 крыніц.

ІНТЫМНАЯ ЛІРЫКА, ЖАНР, ЖАНРАВЫЯ ФОРМЫ, СТЫЛЬ, ПАЭТЫКА, ЛІРЫЧНЫ ГЕРОЙ, АДРАСАТ

Аб'ект даследавання – інтымная лірыка Янкі Купалы, Канстанцыі Буйло, Максіма Багдановіча.

Прадмет даследавання – ідэйна-тэматычны змест, вобразная сістэма, лірычны герой, жанравыя формы інтымнай лірыкі Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Канстанцыі Буйло.

Мэта працы – выявіць спецыфіку беларускай інтымнай лірыкі пачатку XX стагоддзя на матэрыяле твораў Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Канстанцыі Буйло.

Метады даследавання: канкрэтна-гістарычны, біяграфічны, структурна-тыпалагічны, дэскрыптыўны.

Элементы навізны: даказана, што інтымная лірыка – важны складнік беларускай паэзіі пачатку XX стагоддзя, яна ўтрымлівала ў сабе моцны адбітак гістарычнага часу і пісьменніцкай індывідуальнасці; прыведзена класіфікацыя жанравых форм беларускай інтымнай лірыкі пачатку XX стагоддзя.

Тэарэтычная і практычная значнасць: праца можа быць выкарыстана ў працэсе вывучэння творчасці класікаў на ўроках беларускай літаратуры, пры падрыхтоўцы і правядзенні факультатыўных і пазакласных заняткаў па беларускай літаратуры.

**Змест**

Уводзіны ........................................ 4

1 Інтымная лірыка Янкі Купалы ........................................ 9

2 Свет кахання ў лірыцы Максіма Багдановіча ........................................ 39

3 Каханне ў паэзіі Канстанцыі Буйло ........................................ 53

Заключэнне ........................................ 61

Спіс выкарыстанай літаратуры ........................................ 64

Спіс апублікаваных навуковых прац ........................................ 70

**Уводзіны**

Лірыка – адмысловы род літаратуры, напісанне лірычнага твора надзвычай суб'екты, душэўна апасродкаваны від паэтычнай творчасці. Лірыка своеасабліва вымярае і вывярае каардынаты таго рэальнага свету, у якім існуе чалавек. Для паэта-лірыка свет адмысловы, бо ён адначасова і дастатковы ў сваёй быццёвай невычарпальнасці, і недасканалы, бо душа паэта імкнецца заўсёды да нечага нявдзейсненага, новага, загадкавага. Ідэал, мара, фантазія вядуць паэта-лірыка за сабой, напаўняюць яго паэтычныя адкрыццігльібока індывідуальнымі ды рамантычнымі павевамі, нярэдка праграмуюць, прадвызначаюць яго жыццёвы шлях, спосабы стасункаў з навакольным светам і людзьмі. Паэт-лірык вельмі абвострана адносіцца да разгорнутасці свайго душэўнага свету ў свет свайго існавання, а ва ўзаемадзеянні гэтых двух светаў і рэалізуецца мара паэта пра ідэал. У лірыцы як родзе мастацкай літаратуры найбольш поўна ўвасабляюцца складаныя ўзаемадачыненні духоўнага і матэрыяльнага, суб'ектыўнага і аб'ектыўнага, імгненнага і вечнага, канечнага і бясконцага, асабістага і агульначалавечага. Лірыка ахоплівае асэнсаванне розных сфер, з якімі мае дачыненне чалавек, у тым ліку сферу кахання, узаемадачыненняў мужчын і жанчын.Многія філосафы сцвярджаюць, што свет трымаецца на проціпастаўленнях мужчын і жанчын. Кітайская народная прымаўка сцвярджае, што палова неба трымаецца на жанчынах. Еўрапейскія паэты на працягу існавання мастацтва слова падкрэслівалі, што каханне і павага да жанчыны – гэта вельмі моцная творчая, натхняльная сіла. Антычныя філосафы адзначалі, што каханне і голад кіруюць светам. Вядома, калі няма ежы, то ўзнікае пагроза фізічнаму існаванню чалавека, а калі няма кахання, тады жыццё фізічным ды біялагічным існаваннем толькі і абмяжоўваецца. У наш час кожны чалавек марыць пра шчасце для сябе і для тых, каго ён кахае, каму робіць дабро. Як вядома, шчасце ёсць стан душы. Жанчына – гэта душа пэўнага народа, якая жанчына – такі народ. Зусім не выпадкова, што на працягу стагоддзяў

мужчыны-паэты пісалі пра каханне да жанчыны, па-мастацку канструявалі ідэальны вобраз сваёй суайчынніцы, а праз яго і вобраз сваёй краіны.

Сярод тэматычных груп лірыкі асаблівае месца належыць інтымнай лірыцы. Яе адметнасць у тым, што ў вершах пра каханне спалучаюцца эмацыйнасць з сардэчнасцю, адлюстроўваецца эмацыянальны стан аўтара і яго душэўны настрой, асабіста перажытае аўтарам і дадуманае, убачанае ў жыцці іншых людзей. Лічыцца, што лірыка пра каханне павінна быць мяккай па танальнасці і раніць у самае сэрца сваёй вобразнасцю. Любы верш павінен мець сэнс і выказваць пэўную ідэю або пачуцці з асаблівай сілай, лаканічнасцю і меладычнасцю. Лірыка пра каханне раскрывае душэўны стан самога аўтара і адначасова роду чалавечага – гэта асноўная адметнасць інтымнай лірыкі. Пісьменнік адлюстроўвае ў вершах інтымнай лірыкі свае глыбока асабістыя перажыванні. Таксама для інтымнай лірыкі характэрна шырокае ўжыванне мастацкіх сродкаў (эпітэтаў, метафараў, параўнанняў), але нельга імі перанасычаць тэкст, бо тады сэнс і логіка страчваюцца, а верш паўнавартасна не ўспрымаецца. Яшчэ адна асаблівасць лірыкі пра каханне – гэта частае адлюстраванне суму, пакут чалавечай душы. Адчуванне незадаволенасці, суму часта спадарожнічае чалавеку, яму блізкія настроі, што прысутнічаюць у творах пра нешчаслівае, непадзельнае каханне, пра неажыццёўленасць мары, задуманага. Вершы пра каханне ў сусветнай паэзіі – значная частка духоўнай спадчыны чалавецтва, на працягу доўгага часу яны ствараліся ў форме балад, песняў, санетаў, элегій, рамансаў, мадрыгалаў, сервентаў. Кожная нацыянальная паэзія выпрацавала свае дамінантныя формы: італьянцы – санеты, французы – мадрыгалы, беларусы – песні.

Інтымная лірыка, карыстаючыся вялікай папулярнасцю ў чытацкай, асабліва жаночай, аўдыторыі, незалежна ад яе ўзросту і адукацыйнага ўзроўню, мае найбольшае эмацыянальна-пачуццёвае ўздзеянне на чалавечую свядомасць, бо суадносіцца з жыццёвым вопытам і ўнутранымі перажываннямі амаль кожнага чалавека. І гэта заканамерна, бо адной з

эмацыянальна-каштоўнасных сутнасцей, што прадстаўляе чалавека як самадастатковую асобу, было і застаецца каханне.

Беларуская інтымная лірыка на пачатку XX стагоддзя перажывала час свайго станаўлення, бо ў літаратуры XIX стагоддзя паўнавартасных узораў інтымнай лірыкі на беларускай мове не было, паколькі пісьменнікі больш важнай лічылі грамадскую сферу, а не інтымную ў існаванні чалавека. Істотнай рысай развіцця беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя з'яўлялася тое, што ў ёй на першы план выходзіла асэнсаванне грамадскіх, маральна-этычных і філасофскіх пытанняў, а інтымны свет чалавечых пачуццяў лічыўся другасным, менш значным. Ля вытокаў сучаснай інтымнай лірыкі стаялі Янка Купала і Максім Багдановіч.

Янка Купала – вялікі нацыянальны паэт беларускага народа. Ён узняў беларускае слова на вышыню, якой да яго не ведала беларуская літаратура, а яго творчасць стала ўпоравень з лепшымі ўзорамі сусветнай літаратуры. Прадметам яго паэтычнай цікавасці былі і грамадскае, і асабістае быццё чалавека. Творчасць Янкі Купалы па-свойму мастацкімі сродкамі афарміла і завяршыла станаўленне самасвядомасці беларускага народа, яго псіхалагічнага складу, філасофіі быцця. З поўным правам можна разглядаць творчасць Купалы як энцыклапедыю духоўнага жыцця беларускага народа, бо ў ёй знаходзяць адбітак усе праявы нацыянальнага быту і быцця беларусаў на мяжы дзявятнаццатага і дваццатага стагоддзяў, а таксама перыяду першай сусветнай вайны, трох рэвалюцый, грамадзянскай вайны, савецкай эпохі ўключна да Вялікай Айчыннай вайны. Творчая непаўторнаць вялікага мастака можа выявіцца толькі тады, калі адбудзецца зліццё яго творчай асобы з тымі жыццёвымі з'явамі, якія знаходзяць у яго душы жывы, зацікаўлены водгук. Асоба самабытнага мастака не можа скласціся раней, чым узнікнуць неабходныя для мастацкай сталасці пісьменніка ўмовы, а менавіта: пачуццё нацыянальнай самасвядомасці, пачуццё радзімы, пачуццё нацыянальнай і чалавечай годнасці, што выяўляецца і ў асабістых

узаемадачыненнях. Наяўнасць інтымнай лірыкі – паказчык сталасці нацыянальнай літаратуры і яе прадстаўнікоў.

Інтымная лірыка займае значнае месца ў творчасці Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Канстанцыі Буйло, Алеся Гаруна, радзей да яе вярталіся Гальяш Леўчык, Якуб Колас, Альберт Паўловіч. Беларускія пісьменнікі напісалі шмат вершаў, прысвечаных каханню. Сучасныя даследчыкі шмат увагі надаюць творчаму лёсу аўтараў пачатку XX стагоддзя. У кнігах У.В. Гніламёдава "Ад даўніны да сучаснасці: нарыс пра беларускую паэзію", У.М. Конана "Святло паэзіі і цені жыцця: лірыка Максіма Багдановіча", В.Я. Ляшук "Вывучэнне творчасці Максіма Багдановіча ў школе," Л.К. Тарасюк "Пад зоркай Венеры: лірыка кахання ў паэзіі Максіма Багдановіча", Т.К. Чабан " Космас "Вянка" даследчыцкая ўвага скіравана на аналіз лірычных твораў класікаў айчыннай літаратуры. Неабходна заўважыць, што спецыяльнага даследавання, якое б ахапіла асэнсаванне інтымнай лірыкі паэтаў пачатку XX стагоддзя, у айчынным літаратуразнаўстве пакуль няма. Большасць літаратурных крытыкаў і літаратуразнаўцаў найперш звяртала ўвагу на інтымную лірыку Максіма Багдановіча, але забывала, што не менш значны ўклад унёс Янка Купала. Пэўны ўнёсак зроблены і Канстанцыяй Буйло, гэта правамерна акцэнтавалі А.К. Гардзіцкі ў артыкуле з працы "Беларускія пісьменнікі (1919–1990)" і Д.Т. Чаркасава ў прадмове да зборніка паэтэсы "Коціцца рэха: вершы. Паэмы. Лісты". Даследчыкамі разглядаюцца вершы рознага плана, але найперш, надаецца ўвага лірычнаму герою патрыятычнай лірыкі.

**Мэта** магістарскай дысертацыі – выявіць тыпалагічныя і індывідуальна-аўтарскія асаблівасці інтымнай лірыкі пачатку XX стагоддзя ў беларускай літаратуры.

Задачы вынікаюць з мэты, яны наступныя:

- вызначыць аблічча лірычнага героя ў творах паэтаў,
- акрэсліць тэматыку і праблематыку інтымнай лірыкі Я. Купалы М. Багдановіча і К. Буйло,

- вылучыць асноўныя вобразы,
- устанавіць дамінантныя формы вершаў.

Метады даследавання ў працы – канкрэтна-гістарычны, структурна-тыпалагічны, апісальны.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Александровіч, С.Х. Пуцявіны роднага слова : праблема развіцця беларускай літаратуры і друку другой паловы XIX – пачатку XXст. / С.Х. Александровіч. – Мінск: Выд-ва Беларус. дзярж. ун-та, 1971. – 248 с.
2. Багдановіч, І.Э. Авангард і традыцыя: беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І.Э. Багдановіч. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – 270 с.
3. Багдановіч, І. Э. Янка Купала і рамантызм / І. Э. Багдановіч. – Мінск: Наука і тэхніка, 1989. – 183 с.
4. Багдановіч, М.А. Вянок: вершы, паэмы / Максім Багдановіч; прад. В. Зуёнка. – Мінск : Маст. літ., 2005. – 199 с.
5. Багдановіч, М.А. Інтымны дзённік: выбраныя творы / М. Багдановіч; уклад. Ул. Сіўчыкаў; прадм. Р. Барадулін; маст. А. Кашкурэвіч. – Мінск: Радыёла-плюс, 2006. – 318 с.
6. Багдановіч, М.А. Творы / М. Багдановіч; уклад. В. Барысенка, В. Івашын, М. Лынькоў, Ю. Пшыркоў. – Мінск: Дзяржвыд БССР, 1957. – 237 с.
7. Багдановіч, М.А. Поўны збор твораў: у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991–1993. – Т. 1. – 532 с.
8. Багдановіч М. Поўны збор твораў: у 3 т. Мінск: Навука і тэхшка, 1995. – Т. 2. – 752 с.
9. Багдановіч М.: энцыклапедыя; склад. І. У. Саламевіч, М. В. Трус; навук. рэд. М. В. Трус; рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск: Беларус. энцыкл., 2011. – 608 с.
10. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. - Мінск: Навука і тэхніка, 2011. – Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды.

11.Бахтин, М.М. Эстетика художественного творчества / М.М. Бахтин. – М.: Искусство, 1974. – 383 с.

12.Бахтин, М.М. Литературно-критические статьи / М.М. Бахтин. – М.: Худож. лит., 1986. – 543 с.

13.Бельскі, А. І. Вывучэнне творчасці беларускіх пісьменнікаў: класікі і сучаснікі ў школе / А. І. Бельскі. – Мінск.: Аверсэв, 2005. – 360 с.

14.Борев, Ю.Б. Эстетика. Теория литературы : энцикл. слов. терминов / Ю.Б. Борев. – М. : Астрель : АСТ, 2003. – 575 с.

15.Бугаёў, Д.Я. Спавядальнае слова : літ. крытыка, успаміны / Д.Я. Бугаёў. – Мінск : Маст. літ., 2001. – 327 с.

16.Буйло, К. Выбраныя творы: у 2 т. / К. Буйло. – Мінск: Маст. літ., 1981. – Т. 1: Вершы; паэма. – 1981. – 302 с.; Т. 2: Вершы, успаміны. – 1981. – 334 с.

17.Буйло, К. Курганная кветка. Факсімільнае выданне / К. Буйло. – Мінск: Маст. літ., 1989. – 87 с.

18.Булгакова, А.А. Топика в литературном процессе : учеб. пос. / А.А. Булгакова. – Гродно : Изд-во Гроднен. гос. ун-та, 2008. – 106 с.

19.Бярозкін, Р.А. Свет Купалы / Р.А. Бярозкін. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1981. – 240 с.

20.Вабішчэвіч, Т. Лірыка Максіма Багдановіча ў масавым чытацкім асяроддзі нашаніўскага перыяду / Т. Вабішчэвіч // Роднае слова. – 2010. – №12. – С.14 – 17.

21.Васючэнка, П. Беларуская літаратура пачатку ХХ стагоддзя ў кантэксце еўрапейскага сімвалізму / П. Васючэнка // Скарыназнаўства, кнігазнаўства, літаратуразнаўства: матэрыялы ІІІ Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый», Мінск, 21–25 мая; 4–7 снежня 2000 г. – Мінск, 2001. – С. 96–101.

22.Васючэнка, П.В. Драматургічная спадчына Янкі Купалы: вопыт сучаснага прачытання / П.В. Васючэнка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 171 с.

23.Ватацы, Н.Б. Максім Багдановіч: бібліяграфічны слоўнік / Н.Б. Ватацы. – Мінск: Дзяржбібліятэка БССР імя У.І.Леніна, 1976. – 120 с.

24.Волков, И.Ф. Литература как вид художественного творчества / И.Ф.Волков. – М. : Просвещение, 1985. – 192 с.

25.Гарадніцкі, Я.А. Думка і вобраз / Я.А. Гарадніцкі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1986. – 67 с.

26.Гарадніцкі, Я.А. Мастацкі свет беларускай літаратуры ХХ стагоддзя / Я.А. Гарадніцкі. – Мінск: Беларуская навука, 2005. – 189 с.

27.Гинзбург, Л. Я. О литературном герое / Л. Я. Гинзбург. – Л.: Совет.писатель, 1979. – 221 с.

28.Гніламёдаў, У.В. Ад даўніны да сучаснасці: нарыс пра беларускую паэзію / У.В. Гніламёдаў. – Мінск: Маст. літ., 2001. – 175 с.

29.Гніламёдаў, У.В. Янка Купала: жыццё і творчасць / У.В.Гніламёдаў. – Мінск: Беларус. навука, 2002. – 194 с.

30.Жураўлёў, В.П. Літаратурная традыцыя і дзень сённяшні / В.П. Жураўлёў // Гуманітарныя і сацыяльныя навукі на зыходзе ХХ стагоддзя / НАН Беларусі ; навук. рэд. Л.Ф. Яўменаў. – Мінск, 1998. – С. 468–471.

31.Кабаковіч, А.К. Фальклорныя і анталагічныя традыцыі ў беларускай паэзіі : гіст.-тэарэт. нарыс / А.К. Кабаковіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 127 с.

32.Каваленка В.А. Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры / В.А. Каваленка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – 359 с.

33.Казбярук, У.М. Рамантычны пошук : назіранні над беларус. рамантызмам пачатку ХХ ст. / У.М. Казбярук. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 184 с.

34.Калеснік, У. Тварэнне легенды / У. Калеснік. – Мінск: Маст. літ.,1987. – 383 с.

35.Калядка, С.У. Беларуская сучасная жаночая паэзія: мастацкія канцэпцыі «жаночага шчасця» / С.У. Калядка. – Мінск: Беларус. навука, 2010. – 173 с.
36.Колас, Г. Карані міфаў: літ.-крыт. арт. / Г. Колас. – Мінск: Маст. літ., 1998. – 321 с.
37.Конан, У.М. Святло паэзіі і цені жыцця / У.М. Конан. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1991. – 156 с.
38.Купала, Я. Поўны збор твораў : у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ.,1995–2003. – Т.1. – 1995. – 462 с.
39.Купала, Я. Поўны збор твораў : у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ.,1995–2003. – Т. 2. – 1996. – 342 с.
40.Купала, Я. Поўны збор твораў : у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ.,1995–2003. – Т. 3. – 1997. – 342 с.
41.Купала Я. Поўны збор твораў : у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ.,1995–2003. – Т.6. – 1999. – 430 с.
42.Купала, Я. Зборнік матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці народнага паэта БССР Янкі Купалы; пад. рэд. М. Лынькова. – Мінск: Выд-ва АН БССР, 1952. – 220 с.
43.Лотман, Ю.М. Избранные статьи : в 3 т. / Ю.М. Лотман. – Таллинн : Александра, 1992–1993. – Т. 1 : Статьи по семиотике и типологии культуры. – 1992. – 479 с.
44.Лотман, Ю.М. Структура художественного текста / Ю.М. Лотман. – М. : Искусство, 1970. – 384 с.
45.Лявонава, Е. Верш "Мы доўга плылі ў бурным моры..." Максіма Багдановіча ў падзейна-культурным кантэксце пачатку XX ст./ Е.А. Лявонава // Роднае слова. – 2011. – №2. – С. 9–11.
46.Ляшчынская, В. Слова ў паэзіі Янкі Купалы / В.Ляшчынская. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 102 с.
47.Максімовіч, В.А. Беларуская літаратура першай трэці XX стагоддзя / В.А. Максімовіч. – Мінск: Беларуская навука, 2006. – 297 с.

48.Майхровіч, С. Максім Багдановіч / С. Майхровіч. – Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1958. – 270 с.
49.Мацюхіна, Т. Пейзажная лірыка Максіма Багдановіча ў еўрапейскім кантэксце/ Т. Мацюхіна // Роднае слова. – 2011. – №9. – С.32–33.
50.Мішчанчук, М.І. Беларуская літаратура: Сачыненні. Творчыя працы / М.І. Мішчанчук. – Мінск: Аверсэв, 2010. – 298 с.
51.Навуменка, І.Я. Максім Багдановіч / І.Я. Навуменка. – Мінск: Беларуская навука, 1997. – 182 с.
52.Навуменка, І. Янка Купала: духоўны воблік героя / І. Навуменка. – Мінск: Вышэйшая школа, 1980. – 264 с.
53.Рагойша, В. Напісана рукой Купалы / В. Рагойша. – Мінск: Нар. асвета, 1981. – 56 с.
54.Рагойша, В.П. Мой трыглаў / В.П. Рагойша. – Мінск: Маст. літ., 2016. – 240 с.
55.Разанаў, А. Жыта і васілёк: слова пра Максіма Багдановіча / А. Разанаў // ЛіМ. – 1995. – С. 3–4.
56.Сабуць, А. Творчыя перазовы Максіма Багдановіча і Поля Верлена / А. Сабуць // Роднае слова. – 2009. – №7. – С.14–17.
57.Саверчанка, І. “Збіраць пачнём зярно з зярняці…”: аб творчасці беларускага пісьменніка Янкі Купалы / І.Саверчанка // Беларуская думка. –2010. – №2. – С. 90–95.
58.Сачанка, Б. Сняцца сны аб Беларусі: літ.-крыт. арт. / Б. Сачанка. – Мінск: Беларус. навука,1990. – 290 с.
59.Тарасюк, Л. Пад зоркай Венеры: лірыка кахання ў паэзіі Максіма Багдановіча / Л. Тарасюк // Роднае слова. – 1997. – №4. – С. 34–47.
60.Тарасюк, Л. Рамантызм у беларускай літаратуры / Л. Тарасюк // Роднае слова. – 1998. – № 9. – С. 38–43.
61.Тарасюк, Л. Рамантызм у беларускай літаратуры / Л. Тарасюк // Роднае слова. – 1998. – № 10. – С. 43–50.

62.Чабан, Т. Космас "Вянка" / Т. Чабан // Максім Багдановіч: поўны збор твораў: у 3 т. – Т.1. Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – Мінск, 1991. – С. 3–11.

63.Штэйнер, І.Ф. Беларуская балада : вытокі жанру і паэт. структура / І.Ф. Штэйнер. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 143 с.

64.Эко, У. Открытое произведение : форма и неопределенность в современной поэтике / У. Эко. – СПб. : Symposium, 2006. – 412 с.

65.Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. – Мінск: Беларус. сав. энцыкл., 1984–1987 / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – 1987. – 408 с.

66.Эпштейн, М.Н. Парадоксы новизны: о лит. развитии XIX – XX вв. / М.Н. Эпштейн. – М.: Совет. писатель, 1988. – 416 с.

67.Юрэвіч, У. Янка Купала: нарыс жыцця і творчасці / У. Юрэвіч. – Мінск: Выш. шк., 1983. – 249 с.

68.Ярош, М. Пясняр роднай зямлі: жыццё і творчасць Я.Купалы / М. Ярош; прадмова В. Жураўлёва. – 2-е выд. – Мінск: Беларус.навука, 2003. – 350 с.

69.Яскевіч, А. Выхад за круг: літаратуразнаўчыя артыкулы / А. Яскевіч. – Мінск: Маст. літ., 1985. – 247 с.

70.Яскевич, А.С. Становление белорусской художественной традиции / А.С. Яскевич. – Минск : Наука и техника, 1987. – 232 с.